Канцэрн Беллегпрам
Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны каледж легкай прамысловасці имя. В.Я. Чарнышова»

Метадычныя рэкамендацыі па выкананню абавязковай кантрольнай работы па прадмету «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» для завочнага аддзялення.

Распрацавала: выкладчык “Беларуская мова (прафесійная лексіка)” Шылейка В.І.

2022

Тлумачальная запіска

Беларуская мова (прафесійная лексіка) – вучэбны прадмет, які дапамагае навучэнцам далучыцца да багацця ў нацыянальнай культуры, сфарміраваць камунікатыўна развітую асобу, здольную наладжваць зносіны на роднай мове ў прафесійнай сферы, перакладаць і рэферыраваць прафесійна арыентаваныя і навуковыя тэксты, весці дзелавую дакументацыю, выступаць з навуковымі паведамленнямі іпублічнымі прамовамі і інш.

Асноўныя мэты выкладання вучэбнага прадмета:

- выпрацаваць і замацаваць практычныя ўменні і навыкі граматнага карыстання вуснай і пісьмовай мовай;
- развіць моўна-эстэтычны густ навучэнцаў, звязаны з чысцінёй і правільнасцю мовы;
- пашыраць і ўзбагачаць прафесійны лексічны запас будучых спецыялістаў, выпрацаваць уменне практычнага карыстання тэрміналогіяй і прафесійнай лексікай па абранай спецыяльнасці;
-фарміраваць устаноўкі на практычнае ўкараненне атрыманых навучэнцамі ведаў у іх прафесійнай дзейнасці і іншых сферах сацыяльнай актыўнасці;
- выхоўваць любоў і павагу да мастацкага слова, духоўнай і інтэлектуальнай спадчына беларускага народа, пачуццё нацыянальнай самапавагі і самаідэнтыфікацыі,імкнення да далейшага ўзбагачэння беларускай мовы.

Задачы вывучэння вучэбнага прадмета:

- сфарміраваць у навучэнцаў разуменне неабходнасці ведаць і карыстацца беларускай мовай у прафесійнай дзейнасці;
- даць навучэнцам неабходную сістэму ведаў аб лексічным складзе,тэрміналогіі і маўленчай культуры;
- дапамагчы навучэнцам усвядоміць месца беларускай мовы ў развіцці культуры і ў духоўным адраджэнні нацыі;
- садзейнічаць падрыхтоўцы высокаадукаваных, творчых і крытычна думаючых спецыялістаў, здольных вырашаць складаныя моўна-сацыяльныя праблемы бытавання беларускай мовы ва ўмовах дзяржаўнага білінгвізму.

У працэсе вывучэння вучэбнага прадмета навучэнец павінен ведаць:

-ролю мовы і маўлення ў працэсе сацыяльных зносін,
-функцыі беларускай мовы як асноватворнага кампанента нацыяльнай культуры,
-месца і ролю беларускай мовы ў славянскай і еўрапейскай супольнасці народаў і моў,
- сістэму лексічных, граматычных і стылістычных сродкаў беларускай мовы,
- поўны набор прафесійнай лексікі,
- тэрміналагічныя слоўнікі і даведнікі па адпаведных сферах навукова прафесійнай дзейнасці.

У працэсе вывучэння вучэбнага прадмета навучэнец павінен умець:

- граматна карыстацца вуснай і пісьмовай мовай,
- адэкватна ўспрымаць прафесійныя тэксты і навуковую галіновую інфармацыю,
- перакладаць, анатаваць і рэферыраваць прафесійна арыентаваныя тэксты,
- складаць і весці на беларускай мове дзелавую дакументацыю, рыхтаваць навуковыя і публічныя выступленні.

У працэсе вывучэння вучэбнага прадмета навучэнец павінен валодаць:
- уменнем ствараць звязнае выказванне з улікам задач і сферы камунікацыі,
- уменнем карыстацца тэрміналагічнымі слоўнікамі.

Метадычныя рэкамендацыі па вывучэнню прадмета

Тэма 1. Мова – духоўны скарб народа

Мова ў грамадстве. Функцыянаванне беларускай мовы ва ўмовах білінгвізму. Нормы беларускай літаратурнай мовы.

Паходжанне беларускай мовы і асноўныя этапы яе развіцця. Старабеларуская літаратурная мова XIV – XVI ст. Дзяржаўны статус беларускай мовы ў Вялікім княстве Літоўскім. Нацыянальна-моўная палітыка Рэчы Паспалітай і яе вынікі.

Новая (сучасная) беларуская мова XIX –XX ст. Месца беларускай літаратурнай мовы ў сістэме агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцей.

Пытанні для самакантролю

1. Што вы ведаеце пра сутнасць і прыроду мовы?
2. Пералічыце асноўныя функцыі мовы ў грамадстве, растлумачце іх сутнасць.
3. Якая роля мовы ў сацыяльнай і навуковай дзейнасці чалавека? Пералічыце моўныя патрэбы сучаснага грамадства.
4. Назавіце асноўныя формы існавання мовы, ахарактарызуйце іх.
5. Якія мовы адносяцца да славянскай групы моў? На якія падгрупы дзеляцца славянскія мовы?
6. Дайце азначэнне паняццю *білінгвізм*.
6. Пералічыце прычыны падабенства і адрознення паміж усходнеславянскімі мовамі.
7. Раскажыце пра асаблівасці гістарычнага развіцця беларускай мовы.

Тэма 2. Лексічная сістэма беларускай літаратурнай мовы

Лексіка беларускай мовы паводле паходжання (спрадвечна беларуская і запазычаная) і сферы ўжывання. Змены ў лексічнай сістэме беларускай мовы: актыўная і пасіўная лексіка. Агульнаўжывальная лексіка і лексіка абмежаванага выкарыстання.

Спецыяльная лексіка як частка лексічнай сістэмы сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Адрозненне тэрміналагічнай і прафесійнай лексікі. Паняцце тэрміна. Тэрміны, запазычаныя з іншых моў, іх асваенне беларускай мовай.

Тэрміналогія ў сферы прафесійнай дзейнасці спецыяліста.

З гісторыі беларускай навуковай тэрміналогіі. Тыпы слоўнікаў.

Тэрміналагічныя слоўнікі і даведнікі, іх роля і месца ў лексікаграфічнай сістэме беларускай мовы. Сістэма падачы тэрмінаў у тлумачальных і перакладных слоўніках, у слоўніках іншамоўных слоў.

Пытанні для самакантролю

1. Як фарміраваўся лексічны склад беларускай мовы?

2. Якія словы з’яўляюцца спрадвечна беларускімі?
3. Як трэба ставіцца да ўжывання запазычаных слоў?
4. Якія змены адбываюцца ў лексічнай сістэме беларускай мовы?
5. Што такое лексіка абмежаванага ўжытку?
6. Хто карыстаецца спецыяльнай лексікай?
7. Чым адрозніваюцца тэрміны ад прафесіяналізмаў?
8. Што такое тэрмін?
9. На якія дзве вялікія групы падзяляюцца слоўнікі?
10. Якія вы ведаеце тэрміналагічныя слоўнікі?
11. Раскажыце пра сістэму падачы тэрмінаў у тлумачальных і перакладных слоўніках, у слоўніках іншамоўных слоў.

Тэма 3. Функцыянальныя стылі маўлення

Паняцце функцыянальнага стылю. Класіфікацыя функцыянальных стыляў (навуковы, афіцыйна-справавы, публіцыстычны, мастацкі, размоўны). Публіцыстычны стыль і яго асноўныя асаблівасці. Узаемапранікненне стыляў.

Навуковы стыль і яго асноўныя падстылі (уласна навуковы, , навукова-папулярны, вучэбна-навуковы і інш.).Функцыі навуковага стылю і яго адметныялексічныя, марфалагічныя і сінтаксічныя асаблівасці. Моўныя сродкі навуковага стылю (насычанасць тэрмінамі, перавага абстрактнай лексікі, пераважнаеўжыванне назоўнікаў, пашыранасць формы роднага склону, асаблівая функцыязайменніка мы, шырокае выкарыстанне дзеепрыметнікаў і дзеепрыслоўяў,пашыранасць складаназалежных сказаў з аднароднымі членамі, пабочнымі словамііўстаўнымі канструкцыямі, сродкі лагічнай сувязі паміж сказамі і інш.).

Жанравая разнастайнасць навуковага стылю (артыкул, даклад, рэферат, анатацыя, рэзюме і інш.), агульныя патрабаванні да іх напісання і афармлення.

Афіцыйна-справавы стыль і яго асноўныя падстылі (канцылярскі, юрыдычны,дыпламатычны). Функцыі афіцыйна-справавога стылю і яго характэрныяасаблівасці. Моўныя сродкі афіцыйна-справавога стылю (шырокае выкарыстанненаменклатурных назваў, пашыранасць аддзеяслоўных назоўнікаў, у тым ліку з прэфіксам не-, ужыванне назваў асобы паводле сацыяльнага становішча і сферы дзейнасці ў форме мужчынскага роду, абмежаванае выкарыстанне займеннікаў,пашыранасць інфінітыва, спецыфіка дзеяслоўнага кіравання, расшчапленне выказніка, рэгламентацыя парадку слоў у сказе, канструкцыі са складанымі злучнікамі і адыменнымі прыназоўнікамі. Выкарыстанне безасабовых канструкцый).

Віды афіцыйна-справавых тэкстаў (заява, даверанасць, аўтабіяграфія, дакладная запіска, тлумачальная запіска, кантракг, справавыя пісьмы і інш.), правілыіх напісання і афармлення.

Пераклад на беларускую мову прафесійна арыентаваных тэкстаў.

Пытанні для самакантролю

1. Што называецца стылем мовы? Ахарактарызуйце асноўныя функцыянальныя стылі паводле выкарыстання, функцый, моўных асаблівасцей.
2. Назавіце асноўныя функцыянальныя стылі беларускай мовы.
3. Калі і з якой мэтай карыстаюцца публіцыстычным стылем?
4. Ахарактарызуйце асноўныя падстылі навуковага стылю?
5. Вызначыце функцыі навуковага стылю і яго адметныя лексічныя, марфалагічныя і сінтаксічныя асаблівасці.
6. Па якіх моўных сродках звычайна вызначаюць навуковы стыль?
7. Дзе карыстаюцца афіцыйна-справавым стылем?
8. Вызначыце функцыі афіцыйна-справавога стылю і яго адметныя лексічныя,марфалагічныя і сінтаксічныя асаблівасці.
9. Па якіх моўных сродках звычайна вызначаюць афіцыйна-справавы стыль?
10. Назавіце віды афіцыйна-справавых тэкстаў.

Тэма 4. Культура прафесійнага маўлення

Мова і маўленне. Паняцце культуры маўлення. Асноўныя камунікатыўныя якасці маўлення: правільнасць, дакладнасць, лагічнасць, чысціня і багацце (разнастайнасць) маўлення, дарэчнасць, вобразнасць.

Правільнасць маўлення і моўныя нормы (лексічныя, арфаэпічныя, акцэнталагічныя, словаўтваральныя, марфалагічныя, сінтаксічныя). Тыповыя маўленчыя памылкі, іх прычыны, спосабы выпраўлення.

Прафесійна арыентаванае маўленне.

Падрыхтоўка да публічнага выступлення. Асноўныя якасці-паказчыкі паспяховага выступлення. Узаемадзеянне вербальных і невербальных (жэсты,міміка, рухі) сродкаў маўленчай дзейнасці.

Маўленчы этыкет і культура зносін.

Пытанні для самакантролю

1. Што называецца мовай? Маўленнем?
2. У чым выражаецца сувязь паміж мовай і маўленнем?
3. Назавіце асноўныя якасці культуры маўлення, ахарактарызуйце іх.
4. Назавіце асноўныя камунікатыўныя якасці маўлення.
5. Што такое правільнасць маўлення? Назавіце асноўныя нормы правільнасці.Прывядзіце прыклады.
6. Якія тыповыя маўленчыя памылкі сустракаюцца найбольш часта?
7. Назавіце асноўныя этапы падрыхтоўкі да публічнага выступлення.
8. Для чаго патрэбна ведаць правілы маўленчы этыкету?
9. Узгадайце беларускія формулы ветлівасці, якія вы ўжываеце даволі часта.

Метадычныя рэкамендацыі да выканання абавязковай кантрольнай работы

Адной з форм працы навучэнца-завочніка з’яўляецца выкананне абавязковай

кантрольнай работы, якая дае магчымасць вызначыць веды, уменні, навыкі навучэнцаў, паколькі яна дазваляе праверыць тэарэтычныя веды студэнта, іх практычнае прымяненне.

Каб правільна выканаць заданні абавязковай кантрольнай работы, патрэбна пазнаèміцца з тэарэтычным матэрыялам, бо многія заданні маюць тэарэтычныхарактар(напрыклад, указаць асаблівасці стылю, выпісаць словы-тэрміны, знайсцізапазычаныя словы і г д).

Развіццю маўленчай мабільнасці, адчуванню слова, удасканальванню навыка дакладнасці выбару слова ў адпаведнасці з кантэкстам садзейнічае пераклад. Пераклад патрэбна рабіць з захаваннем настрою, зместу, з улікам спалучальнасці слоў у пэўным кантэксце. Так пры перакладзе з некалькіх магчымых слоў важна выбраць тое, якое адпавядае дадзенаму кантэксту, яго стылèвай накіраванасці.

Пытанні

1. Паняцце функцыянальнага стылю. Класіфікацыя функцыянальных стыляў.
2. Публіцыстычны стыль маўлення. Асаблівасці.
3. Навуковы стыль. Моўныя сродкі навуковага стылю.
4. Афіцыйна-дзелавы стыль. Моўныя сродкі афіцыйна-дзелавога стылю.
5. Тыпы маўлення.
6. Культура прафесійнага маўлення. Асноўныя якасці культуры маўлення.
7. Мова і соцыум. Функцыі мовы ў грамадстве.

Метадычныя рэкамендацыі па вывучэнню тэмы

Тэма 1. Лексічная сістэма беларускай літаратурнай мовы

Лексіка беларускай мовы паводле паходжання (спрадвечна беларуская і запазычаная) і сферы ўжывання. Змены ў лексічнай сістэме беларускай мовы: актыўная і пасіўная лексіка. Агульнаўжывальная лексіка і лексіка абмежаванагавыкарыстання.

Спецыяльная лексіка як частка лексічнай сістэмы сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Адрозненне тэрміналагічнай і прафесійнай лексікі. Паняцце тэрміна. Тэрміны, запазычаныя з іншых моў, іх асваенне беларускай мовай.

Тэрміналогія ў сферы прафесійнай дзейнасці спецыяліста.

З гісторыі беларускай навуковай тэрміналогіі. Тыпы слоўнікаў.

Тэрміналагічныя слоўнікі і даведнікі, іх роля і месца ў лексікаграфічнай сістэмебеларускай мовы. Сістэма падачы тэрмінаў у тлумачальных і перакладныхслоўніках, у слоўніках іншамоўных слоў.

Пытанні для самакантролю

1. Як фарміраваўся лексічны склад беларускай мовы?
2. Якія словы з’яўляюцца спрадвечна беларускімі?
3. Як трэба ставіцца да ўжывання запазычаных слоў?
4. Якія змены адбываюцца ў лексічнай сістэме беларускай мовы?
5. Што такое лексіка абмежаванага ўжытку?
6. Хто карыстаецца спецыяльнай лексікай?
7. Чым адрозніваюцца тэрміны ад прафесіяналізмаў?
8. Што такое тэрмін?
9. На якія дзве вялікія групы падзяляюцца слоўнікі?
10. Якія вы ведаеце тэрміналагічныя слоўнікі?
11. Раскажыце пра сістэму падачы тэрмінаў у тлумачальных і перакладных слоўніках, у слоўніках іншамоўных слоў.

Літаратура

1. Абражэвіч, Т.У. Беларуская мова (прафесійная лсксіка). Машынабудаванне : дапам. / І.У. Абражэвіч. Мінск : РІПА, 2016. 96 с.
2. Батура, Т.В. Беларуская мова (прафесійная лсксіка). Аўтаматызацыя : вучэб. дапам. / Т.В. Батура. Мінск : РІПА, 2018. 113 с.
3. Беларуская мова : вучэб. дапам. / В.М. Богдан [і інш.] ; пад рэд. Л.П. Тамілінай. Мінск : НПА, 2019. 381 с.
4. Беларуская мова (прафесійная лсксіка). Педагогіка : вучэб. дапам. / Д.В. Дзятко [і інш.] ; над агул. рэд. Д.В. Дзятко. Мінск : РІПА, 2020. 279 с.
5. Беларуская мова (прафесійная лсксіка). Транспарт : вучэб. дапам. / І.У. Будзько [і інш.] ; пад агул. рэд. Л.А. Гіруцкай. Мінск : РІПА, 2019. 223 с.
6. Беларуская мова (прафесійная лсксіка). Эканоміка: практыкум : вучэб. дапам. / Д.В. Дзятко [і інш.] ; пад агул. рэд. Д.В. Дзятко. Мінск : РІПА, 2020. 207 с.
7. Зразікава, В.А. Беларуская мова. Прафесійная лексіка для эканамістаў : вучэб. дапам. / В.А. Зразікава, А.В. Губкіна. Мінск : Вы…. шк., 2016. 383 с.
8. Кандраценка Л.М. Беларуская мова (прафесійная лексіка). Лёгкая прамысловасць.- РІПА,2020
9. Маршэўская, В.В. Беларуская мова. Прафесійная лексіка для юрыстаў і эканамістаў : вучэб. дапам. / В.В. Маршэўская, А.С. Садоўская. Мінск : РІВШ, 2020. 231 с.
10. Чатырка, Д.М. Беларуская мова (прафесійная лексіка). Грамадскае харчаванне : вучэб. данам. /Д.М. Чатырка. 2-е выд., стэр. Мінск : РІПА, 2018. 153 с.
11. Шабліцкая, Н.В. Беларуская мова (прафесійная лексіка), Будаўніцтва : вучэб. дапам. / Н.В. Шабліцкая. Мінск : РІПА, 2020. 131 с.
12. Шаркова А.М. Беларуская мова (прафесійная лексіка) / А.М. Шаркова. - Минск: РИПО, 2014. - 322 с.
13. Шумчык, В.С. Беларуская мова (прафесійная лсксіка). Вылічальная тэхніка : вучэб. дапам. / Ф.С. Шумчык, Н.М. Акуліч. Мінск : РІПА, 2018. 147 с.

Слоўнікі

1. Беларускі арфаграфічны слоўнік / Нац. акад. навук Беларусі, ін—т мовыі літ. імя Якуба Коласа і Янкі Купалы ; уклад. Л.П. Кунцэвіч. Мінск :Беларус. навука, 2012. 694 с.

2. Маракуліна, Т.М. Слоўнік арфаграфічных новаўвядзенняў беларускай мовы / Т.М. Маракуліна, І.Л. Капылоў. Мінск : Соврем. шк., 2011. 96 с.

3. Разам, асобна, праз злучок : даведнік : дапам. Для настаўнікаў / склад. : Н.Д. Бандаранка, 1.Л. Капылоў, Т.М. Маракуліна ; над рэд. А.А. Лукашанца. Мінск : Аверсэв, 2013. 192 с.

4.Русско-белорусский словарь : в 3 т. / пад рэд. А.А. Лукашанца. 10-е изд., перераб. и доп. Мінск : БелЭн, 2012.

5Русско-белорусский политехнический словарь : в 2 т. / под ред. И.Л. Пурак [и др.]. Минск : Беларус. навука, 1998.

6.Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы / пад рэд. М.Р.Судніка, М.Н. Крыўко. 3-е выд. Мінск : БелЭн, 2002, 784 с.

ПРЫКЛАДНЫЯ КРЫТЭРЫІ АЦЭНКІ ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НАВУЧЭНЦАЎ.

Ацэнка у балах	Паказчыкі ацэнкі
1 (адзін)	Адрозненне аб’ектаў вывучэння праграмнага вучэбнага матэрыялу, прапанаваных у гатовым выглядзе (фактаў, тэрмінаў, азначэнняў)
2 (два)	Частковае ўзнаўленне праграмнага вучэбнага матэрыялу па памяці (фрагментарны пераказ і пералічэнне асноўных тэрмінаў, азначэнняў беларускай мовы (прафесійная лексіка)
3 (тры)	Узнаўленне часткі праграмнага вучэбнага матэрыялу па памяці (фрагментарны пераказ і пералічэнне асноўных тэрмінаў, азначэнняў беларускай мовы (прафесійная лексіка), частковае валоданне спецыяльнай тэрміналогіяй); ажыццяўленне разумовых і практычных дзеянняў па ўзоры
4 (чатыры)	Узнаўленне большай часткі праграмнага вучэбнага матэрыялу (апісанне з элементамі тлумачэння асноўных азначэнняў беларускай мовы (прафесійная лексіка), частковае валоданне спецыяльнай тэрміналогіяй), прымяненне ведаў і ўменняў у знаёмай сітуацыі па ўзоры: наяўнасць адзінкавых істотных памылак
5 (пяць)	Асэнсаванае ўзнаўленне большай часткі праграмнага вучэбнага матэрыялу (тлумачэнне тэрмінаў і азначэнняў беларускай мовы (прафесійная лексіка), частковае валоданне спецыяльнай тэрміналогіяй); прымяненне ведаў у знаёмай сітуацыі па ўзоры; наяўнасць істотных памылак.
6 (шэсць)	Поўнае веданне і асэнсаванае ўзнаўленне ўсяго вучэбнага праграмнага матэрыялу, валоданне вучэбным праграмным матэрыялам у знаёмай сітуацыі (апісанне і тлумачэнне азначэнняў і правілаў бсларускай мовы (прафесійная лексіка), частковае валоданне спецыяльнай тэрміналогіяй); выкананне заданняў па ўзоры на аснове прадпісанняў; наяўнасць неістотных памылак.
7 (сем)	Поўнае, трывалае веданне і асэнсаванае ўзнаўленне ўсяго вучэбнага праграмнага матэрыялу, валоданне вучэбным і праграмным матэрыялам у знаёмай сітуацыі (разгорнутае апісанне і тлумачэнне азначэнняў і правілаў беларускай мовы (прафесійная лексіка), абгрунтаванае выкарыстанне пэўных моўных сродкаў, валоданне спецыяльнай тэрміналогіяй), недастатковае самастойнае выкананне заданняў; наяўнасць адзінкавых неістотных памылак.
8 (восем)	Поўнае, трывалае, глыбокае веданне і ўзнаўленне праграмнага вучэбнага матэрыялу, аперыраванне праграмным вучэбным матэрыялам у знаёмай сітуацыі (разгорнутае апісанне і

	тлумачэнне азначэнняў і правілаў беларускай мовы (прафесійная лексіка), абгрунтаванае выкарыстанне моўных сродкаў, валоданне спецыяльнай тэрміналагіяй); самастойнае выкананне заданняў; наяўнасць адзінкавых неістотн ых памылак
9 (дзевяць)	Поўнае. грунтоўнае, глыбокае веданне і ўзнаўленне праграмнага вучэбнага матэрыялу, аперыраванне праграмным вучэбным матэрыялам у часткова зменена й сітуацыі (прымяненне азначэнняў і правілаў беларускай мовы (прафесійная лексіка), абгрунтаванае выкарыстанне моўных сродкаў, свабоднае валоданне спецыяльнай тэрміналогіяй, самастойнае выкананне заданняў.
10 (дзесяць)	Свабоднае аперыраванне праграмным вучэбным матэрыялам , прымяненне ведаў і ўменняў у незнаёмай сітуацыі (самастойныя дзеянні пры апісванні, тлумачэнні, аналізе, параўнанні , ацэньванні тэрмінаў і азначэнняў, выкарыстанне адпавядаючых сітуацыі прафесіянальных зносін моўных і маўленчых сродкаў), знаходлівасць пры рашэнні праблемных задач.